СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# Веды — ключ да ўсяго

## Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ наведаў Зэльвеншчыну

**На парадку дня сенатара было некалькі пунктаў: сустрэча з педагогамі раёна, удзел у круглым стале і ў цырымоніі адкрыцця «Ганненскага кірмашу».**

Спачатку сенатар завітаў у гімназію № 1, дзе ў рамках адзінага дня інфармавання абмеркаваў з работнікамі ўстановы адукацыі актуальную на сённяшні дзень тэму — «Вялікую размову з Прэзідэнтам».

Ключавыя моманты адкрытага дыялогу Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі грамадскасці, экспертнай і медыйнай супольнасці нагадаў аўдыторыі старшыня райвыканкама Дзяніс Альшэўскі. Пасля таго Віктар Лісковіч адказаў на пытанні, якія цікавяць настаўнікаў. Датычыліся яны грамадзянска-патрыятычнага, працоўнага выхавання дзяцей і моладзі, арганізацыйнай і заканатворчай работы верхняй палаты беларускага парламента, яе сутнасці і ўкладу сенатараў у стабільнае, паступальнае развіццё нашага грамадства.

— З зэльвенцамі мы дэталёва абмеркавалі асноўныя канцэптуальныя тэзісы галоўнай падзеі гэтага месяца. Прыемна, што людзі, якія сядзелі ў зале, успрынялі размову з цікавасцю. Гэта было відаць па іх саміх, нягледзячы на тое, што яны раней ужо праслухалі выступленне кіраўніка дзяржавы, — цытуе Віктара Лісковіча раённая газета «Праца». — Бо сёння для кожнага беларуса важна вызначыць сваю ролю ў тых праблемных момантах, якія былі агучаны Прэзідэнтам.



Пасля гутаркі з педагогамі сенатар узяў удзел у круглым стале, які быў прысвечаны 300-годдзю «Ганненскага кірмашу» ў Зэльве і праходзіў на базе раённай бібліятэкі. У пасяджэнні ўдзельнічалі таксама старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін Семянякa, супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі — загадчык аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Аляксандр Доўнар, старшы навуковы супрацоўнік гэтага аддзела Тацццяна Доўгач, дактарант Раіса Зянюк, дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Таццяна Вараніч і іншыя. Як паведамілі ў профільнай камісіі Савета Рэспублікі, адбылася жывая дыскусія аб развіцці краязнаўчай дзейнасці і захаванні гістарычнай спадчыны. У рамках дыскусіі абмеркаваны гісторыя станаўлення свята як феномена эканамічнага і культурнага жыцця беларусаў, этапы развіцця Зэльвенскага краю.

Аднак толькі гэтым рабочы візіт не абмяжоўваўся: Віктар Лісковіч, акрамя ўдзелу ў згаданых вышэй мерапрыемствах, таксама ўзначаліў судзейскую калегію двух конкурсаў, якія праходзілі ў першы дзень «Ганненскага кірмашу», — «Рыбныя прысмакі» і «Заплыў на абы-чым».

Дарэчы, ініцыятарам правядзення конкурсу самаробных плаваючых сродкаў на Гродзеншчыне некалі стаў менавіта Віктар Лісковіч.

Адзначым, што пачатак такім стартам быў дадзены яшчэ ў 2015 годзе на Аўгустоўскім канале. Трэба сказаць, вельмі відовішчная і захапляльная падзея.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА, фота газеты «Праца».**

# МЯДОВЫ РАЙ КЛІЧА НА ЕЛЬШЧЫНУ

**Як узаемадзеянне органаў мясцовага кіравання і самакіравання, сфер культуры, адукацыі, спорту і турызму спрыяе пашырэнню прыватнай ініцыятывы па развіцці аграэкатурызму? На прыкладзе праектаў Ельскага раёна гэта прааналізавалі дэпутаты базавага ўзроўню Гомельшчыны.**



Узяць удзел у выязным семінары на Ельшчыну прыехала старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зянкевіч і старшыні раённых Саветаў дэпутатаў вобласці. Гасцей з розных куткоў рэгіёна цікавяць станоўчыя прыклады работы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны раёна. Варты ўвагі і вопыт Ельшчыны па ўкараненні новых формаў паслуг на маршрутах аграэкатурызму, папулярызацыі адкрыцця аграсядзіб сярод вясковага насельніцтва.

У Дабрынскім культурна-спартыўным цэнтры ўдзельнікі семінара азнаёміліся з брэндавымі выстаўкамі Ельскага краю. Прадстаўленыя экспазіцыі яскрава перадаюць тое, як работа педагогаў з вучнямі ў школах і навучэнцамі ў цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі дапамагае захоўваць самабытныя традыцыі і адметныя рамёствы раёна.

— У нас распрацаваны турыстычны маршрут «Палескія таленты», дзякуючы якому кожная ўстанова культуры мае магчымасць прадстаўляць свае нумары, праграмы, — расказаў **загадчык Старавысокаўскага цэнтра культуры Уладзімір НЕВЯРОЎСКІ.** — Гэтыя здабыткі мы можам дэманстраваць як на маршруце ў сваёй установе, так і на тэрыторыі аграсядзіб.

У клубе аграгарадка Старае Высокае Уладзімір Цімафеевіч адпрацаваў 36 гадоў. Кажа, у іх населеным пункце склалася вельмі ўдалае супрацоўніцтва работнікаў сферы культуры, адукацыі і гаспадароў аграсядзіб.

— Праводзім шмат мерапрыемстваў. Асабліва шмат ладзім свят для гарадскіх дзяцей з Мазыра і Калінкавіч, — тлумачыць Уладзімір Невяроўскі. — Гаворка не толькі пра фальклорныя святы, але і пра больш сучасныя праграмы. Наладзілі супрацоўніцтва з Млыноцкім культурна-спартыўным цэнтрам (гэта, дарэчы, іншы бок раёна, але ніякага значэння тое не мае). У іх вельмі добрая гульнявая праграма з аніматарамі для дзетак, так што прыязджаюць да нас, і разам арганізоўваем мерапрыемствы.

Уладзімір Цімафеевіч выступае і ў вобразе сцэнічнага мужа гаспадыні аграсядзібы «У залатой пчолкі мядовы рай» Любові Уласенкі. Менавіта на яе падворак завіталі ўдзельнікі выязнога семінара. Для дэпутатаў адбыўся міні-паказ праграмы «Добры дзень вам, госцейкі!». Таксама былі прадстаўлены майстар-клас бытавых танцаў, выстаўка вырабаў народнай творчасці і адмысловы майстар-клас ад народных умельцаў.

У вёсцы Жукі дэпутаты пазнаёміліся з гаспадыняй аграсядзібы «Васіліса Цудоўная» Аленай Лагвіненкай. Менавіта яна змагла аб'яднаць вопыт стварэння вясковай турыстычнай зоны адпачынку і месца памяці аб удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны Васілісе Прохаравай (родная цётка гаспадыні аграсядзібы). Падворак з гонарам нясе імя вядомага героя Ельскага краю.



Уражаннямі ад наведвання аграсядзіб і знаёмства з вопытам вяскоўцаў па развіцці агратурызму падзялілася **старшыня Хойніцкага раённага Савета дэпутатаў Галіна БОНДАР:**

— Хочацца адзначыць, што Ельскі раён — прыгожы, утульны куток, дзе створаны ўсе ўмовы, каб добра жыць, працаваць, развівацца. Як можна было ацаніць, тут старанна захоўваецца культурная спадчына. Аграсядзібы, якія мы наведалі, — гэта душа вяскоўцаў. Упэўненая, што чым больш такіх аграсядзіб будзе на тэрыторыі вобласці, тым будзе лепш для ўсіх жыхароў рэгіёна. Асабліва гэта важна для развіцця сельскіх тэрыторый.

Падводзячы вынікі семінара, **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ** заўважыла, што ў Ельскім раёне працуе восем аграсядзіб, першая з іх была адкрыта ў 2010 годзе ў вёсцы Дабрынь. Агратурызм — гэта сацыяльны праект развіцця сельскіх тэрыторый, які садзейнічае занятасці насельніцтва:

— Адзначу станоўчы вопыт раёна па стварэнні кластараў агратурызму. Развіваецца прыватна-дзяржаўнае партнёрства ў дадзенай сферы. Гэта вельмі важна з боку стварэння новых рабочых месцаў, якія адкрываюць самі людзі. Важнае і актыўнае ўключэнне ў гэтую работу аддзелаў культуры, спорту і турызму, адукацыі райвыканкама. Так, госці аграсядзіб не толькі атрымліваюць умовы для адпачынку, але і далучаюцца да культурна-пазнавальных праграм і мерапрыемстваў.

Між тым, у Ельскім раёне ўпэўненыя, што агратурызм — рэальны сектар эканомікі, высокарэнтабельная, прыбытковая дзейнасць. Гэты раён на поўдні Гомельшчыны папулярны сярод турыстаў з Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Ізраіля і Галандыі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2021 года.